**«КРЫТЫКУ»** («Чэліні статуй не рабіў»), верш Б. Датуецца 1913. Напісаны ў Яраслаўлі. Жанравая разнавіднасць твора — трыялет. У вершы выкладзены некалькі важных думак, у якіх сцвярджаюцца агульныя маст.-эстэт. прыярытэты Б. Па-першае, тут агучваецца крэда паэта: зварот да замежнай спадчыны ўзбагачае крыніцы нац. прыгожага пісьменства. Б. адштурхоўваецца ад імя італьянскага скульптара, ювеліра эпохі маньерызму Б.Чэліні, запазычвае з класічнай паэзіі вершаваную форму трыялета. Па-другое, у вершы спалучаны вобразы розных відаў мастацтва: услаўляецца мастацтва скульптуры ў форме паэт. слова. Па-трэцяе, творца апіраецца на класічныя ўзоры з мэтай замацавання пэўных маст. прынцыпаў. Хоць Б. Чэліні вядомы і як аўтар скульптур (у т.л. «Персэя»), перш за ўсё ён знакаміты творамі малых форм (ювелірныя вырабы, статуэткі). Паралель, ужытая Б.: малая форма ў скульптуры («Чэліні статуй не рабіў, а толькі статуэткі») не перашкодзіла майстру дасягнуць вяршынь майстэрства, – дазваляе апасродкавана выказаць упэўненасць паэта ў тым, што зварот да малых паэт. форм не перакрые шляхі да вышынь паэзіі. Своеасаблівая жанравая форма трыялета ўзмацняе паэтаву думку: у вершы тройчы паўтараецца загалоўны радок. Тройчы адмаўленне гучыць як настойлівае патрабаванне таго, каб «крытык» мог пераканацца ў слушнасці паэт. выказвання. На думку С.Шумаковіча, «верш з'яўляецца адказам М.Багдановіча крытыку — «верхнепалацінцу» з «Нашай нівы», які дапякаў паэта тым, што ён піша невялікія па памеру вершы». Па-чацвёртае, паэт уводзіць у бел. паэзію ідэальную форму трыялета, выдатны яе ўзор на роднай мове, маркіруючы свой верш і ў падзагалоўку, і ў тэксце.

Упершыню — «Гадавік Бел.навук.тав-ва» кн. 1. Вільня, 1933. Аўтограф захоўваецца ў рукапісным аддзеле б-кі АН Літвы.

*Г.Я.Адамовіч.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ